# ЛЫСАГОРСКІЯ ВЕРШЫ ВАСІЛЯ ЗУЁНКА: ТЭМЫ І МЭТЫ

*Н.В. Заяц (Мінск, Беларусь)*

Аб’ектам даследавання з’яўляюцца вершы В. Зуёнка, сабраныя ў нізцы «Апраўданне Лысай гары». Вызначаюцца праблемна-тэматычныя дамінанты лірычнай падборкі, аналізуецца сістэма вобразаў. Напісаныя на Лысай гары новыя творы разглядаюцца ў кантэксце паэзіі В. Зуёнка.

**Ключавыя словы:** В. Зуёнак; «Апраўданне Лысай гары»; верш; нізка вершаў; паэзія; філасофская лірыка.

На персанальным сайце майстра беларускага слова Васіля Зуёнка існуе раздзел «Тэмы і мэты», створаны па ініцыятыве пісьменніка. У ім змешчаны дзве нізкі вершаў мяжы XX–XXI стагоддзяў «Апраўданне Лысай гары» і «Царства Грыбное». Мэта гэтага матэрыялу – правесці літаратуразнаўчы аналіз першай з іх, напісанай на самым вядомым беларускім лецішчы.

Падборцы папярэднічае аўтарская рэмарка – своеасаблівы гісторыка-літаратурны каментарый, у якім пададзена эксклюзіўная інфармацыя пра творчы працэс, «пашпартызаваны» не толькі гэтыя, але і ранейшыя мастацкія тэксты. «“Апраўданне” – гэта як бы дыялог (у працяг) з тымі насмешлівымі і трапнымі “атэстацыямі” Ведзьмака Лысагорскага, – дзеліцца В. Зуёнак. – А сама “Лысая гара” (афіцыйна: “Узгор’е-1”; “Узгор’е-2” створана пазней) гэта ўжо зараз далёкая гісторыя. Творчыя ж людзі тут жылі і не маглі не займацца наканаванай талентам і здольнасцямі, творчай працай. Вось тут пададзена і “часцінка” такой працы (праўда, у «шэрагах» лысагорцаў аўтар з’явіўся пазней часу, калі твары́ў Вядзьмак Лысагорскі, – магчыма таму і не трапіў у паэму)… А “часцінка” – толькі з таго, што непасрэдна падказвалася Лысай гарою, бо апроч гэтага выступае шмат іншага, – “Маўчанне травы”, прыкладам, або кніжка для дзяцей пра беларускія грыбы “Па ельнічку, па бярэзнічку”, дзе “дзед з унукам Васілі, знатакі грыбныя, скалясілі, абышлі сцежкі ўсе лясныя”…» [2] [1].

Эпіграф да «Апраўдання» – «…бярозавае / …прыгорнае / …грыбное / …лясное / …нябеснае / …асенняе / …пакліканае» – лаканічны, але пры гэтым надзвычай змястоўны. Ім паэт і пазначае ключавыя тэмы, і ўказвае на зместавую дамінанту вершаў, што ўяўляюць сабой узоры філасофскай і пейзажнай лірыкі, і акрэслівае іх (вершаў) прасторава-часавыя каардынаты. Творы суадносяцца з усімі порамі года, акрамя зімы; цыкл пачынаецца «вясновым» вершам і заканчваецца «асеннімі», зімовы слоўны малюнак сустракаецца толькі аднойчы ў элегічнай замалёўцы «Бяроза ў заснежанай стыні…». Гэта тлумачыцца адметнасцю месца нараджэння нізкі: лецішча пусцее ў халады і ажывае з надыходам цяпла. «Восьмага траўня. Зялёнае. Ластаўкі: / Промні двухкрылыя позняй вясны – / Вёрткім «віць-віць» перакрылі ўсе застаўкі / Стылым вятрам і снягам навясным. // Гэтак зіма неадступна трымалася, / А перад кволенькім вострым крылом / Нешта ў душы зледзянелай зламалася, / І захліснулася, / І задыхнулася / Траўным цяплом». Працытаваны

[2] Тут і далей вершы цытуюцца з гэтай крыніцы: Зуёнак, В. Апраўданне Лысай гары [Электронны рэсурс] / В. Зуёнак // Васіль Зуёнак : сайт. – Рэжым доступу: https://sites.google.com/site/vasilzueenak/тэмы-і-мэты/апраўданне-лысай-гары. – Дата доступу: 01.09.2024.

верш «Сышла вясна на станцыі Зялёнае…» (менавіта на гэтым чыгуначным прыпынку выходзяць з электрычкі лысагорскія дачнікі) выступае ўверцюрай і задае настрой усёй нізцы – віталістычны насуперак самым розным турботам і складанасцям. Лакальна прывязаныя да канкрэтнай мясціны творы выяўляюць неаднаразова акцэнтаваную даследчыкамі здольнасць В. Зуёнка паяднаць «дробнае», зменлівае, зямное з маштабным, вечным, галактычным, падкрэсліць іх знітаванасць. Тут таксама адбываецца «плённае збліжэнне і ўзаемадзеянне <...> дзвюх стылявых тэндэнцый: маштабу ўспрыняцця быцця і вострай увагі да яго прыватных падрабязнасцей» [2, с. 623], пра якое пісаў У. Гніламедаў, характарызуючы яшчэ другую кнігу паэта «Крутаяр» (1969). Дзякуючы ўдала знойдзенай у самым пачатку творчага шляху «оптыцы», адметнаму спосабу рэцэпцыі свету мастак слова праз канкрэтыку, «прыватныя» рэчы натуральна, нязмушана і ненавязліва выходзіць на філасофскія абагульненні.

Цэнтральны ў «Апраўданні» вобраз бярозы на селішчы, якую на Лысай гары празвалі Зуёнкавай. Сузіранне дрэва адкрывае паэту значна больш шырокі далягляд, актуалізуючы ў лірыцы антыноміі «жыццё – смерць», «час – вечнасць», «зямное – нябеснае», «прастора – час»: «Гэта я… – ці не пазналі, зоры? – / З-пад зямной бярозы гавару, – / Вечнасцю закінуты ў прастору / На паслугі часу-ліхвяру. // Не, яна яшчэ не над магілай – / Вецце нахінае над страхой / Сноў маіх і думак берагіняй, / Патаемкай у журбе ліхой. // <…> Ці не прыадчынеце заслону: / Як я з вамі буду побач жыць – / Па нябесных ці зямных законах / Тую службу вечнасці служыць?..» («З-пад зямной бярозы…»). Вершы пра бярозу можна разглядаць як «нізку ў нізцы» са сваёй унутранай дынамікай, эпічнай разгорнутасцю: гэта завершаная гісторыя нараджэння, жыцця і заўчаснай смерці дрэва ад рук чалавека. Творы розныя па настроі і рытміка-інтанацыйным малюнку, кожны з іх раскрывае свежую старонку «біяграфіі» бярозы, узаемаадносін лірычнага героя з даўняй суседкай і сяброўкай. Не перастае ўражваць уменне В. Зуёнка бачыць новае ў даўно знаёмым, незвычайнае ў паўсядзённым: «У бярозы крона неўспадзеў / Пасмы апусціла жаўталіста. / Да жанчын ці пераспелых дзеў / Гэтак сівізна ідзе імгліста. // Трапяткі і горасны спалох / На душу асенне ападае… / А бярозу, знаць, ратуе бог: / Тых трывог яна зусім не знае» («У бярозы крона неўспадзеў…»).

Кульмінацыяй гісторыі з’яўляецца дзвюхчастковы верш «Зялёны шум». Першая частка песімістычная: гэта споведзь дрэва перад тым, як яго абсеклі па надуманай прычыне (яно нібыта замінала суседу): «Сказаць вам, як бярозы паміраюць? / Не чулі і не бачылі? Тады / Скажу найперш: я не зусім старая – / У самым росквіце шумяць мае гады». Перадача голасу «персанажу», тым больш не чалавеку, а прадстаўніку прыроднай стыхіі, выяўляе анімістычнае ўспрыняцце паэтам прыроды як жывой, надзеленай душой істоты. «Я»-форма дазваляе стварыць адпаведны настрой – асуджанасці, наканаванасці, паказаць ахвярнасць Дрэва, што паўстае сімвалам жыцця і крыніцай натхнення. «Ну што ж, пілуйце… Толькі ці ўлічылі, / Як весніла я злыбедныя дні, / Як ціхім шэптам ад згрызот лячыла, / Як дзетак выпраўляла ў свет шпачыных, / А песень, песень колькі!.. – не злічыла… // Наўслед пагрэйцеся, як я згару ў агні… // І ты, паэт, згадай: а колькі рыфмаў / Пад кронаю выкрэсвала сціло. / Хай не заўжды радок сугучна ўспыхваў, / Ды «слёзы» – і – «бярозы» – не было». Другая частка

выступае пастскрыптумам сумнай споведзі, але жыццесцвярджальным і светлым: канчаткова вынішчыць бярозу не ўдалося («…чупрыну падкарналі, / А верхавіну ўходаць не змаглі»). Верш, у адрозненне ад іншых, датаваны (11.04.2011), чым падкрэсліваецца важнасць гэтай падзеі. У дадзеным выпадку зафіксаваная ў паэтычнай форме жыццёвая сітуацыя дзіўным чынам упісалася ў традыцыйную для мастацкага свету В. Зуёнка схему, калі хаосу і разбурэнню супрацьстаіць гармонія і ўладкаванасць – смяротнае маўчанне перамагаецца «зялёным шумам». «Не сыдзе (Бог не дасць!) супакаенне / На дрэвавынішчальную душу: / Ідзе бярозак юных пакаленне / І велічна гудзе Зялёны шум! // Хай хцівец злою злосцю абрастае, / А я лясны наказ усім даю: / Вучыцеся, каб буры не хісталі, / Трымацца каранямі за зямлю». Тым не менш для паэта нявечанне бярозы стала асабістай стратай, нарадзіла адчуванне ўласнай віны: «А мне гэты дзень / Хто з памяці здыме? / Ад полымя цень / Гайдаецца ў дыме. // Адпаўзае трава / Ад спякоты пагрознай: / Грэйся сам пры дравах, / Вытры дымныя слёзы, / Калі не ўратаваў / Ад пагубы бярозу…» («Калі не ўратаваў…»).

Тоесны асобе аўтара лірычны герой жыве ва ўнісон са светам прыроды, смуткуе і радуецца разам з ім: «Жывём вясёлаю сям’ёй, / Ідзе ўсё ў хатах ладам, – / Тады і радасць у маёй, / Калі ў драздовай радасць» («Выпадак рэдкі: пеўчы дрозд…»). «Героямі» вершаў выступаюць сямейка драздоў, шпакі і гусі, вясновыя цюльпаны і «перадзімнія астры», «дуб у тры абхваты», «ядловец шызы», «…юнацтва сёстры» сосны, вятры – кожны са сваім «характарам» і ўласнай гісторыяй. На ўлонні прыроды мастак атрымлівае магчымасць «зямны скасаваць настрой», «застацца з сабою сам-насам» («Калі маўчаць дрэвы…»). Лес у ваколіцах Лысай гары паўстае месцам сілы для творцы, адкуль ён чэрпае энергію, дзе супакойвае душу: «Прыходжу да свяцілішча ляснога, / Нібы пад усявышнія пакровы, – / Шукаць паразуменне і падмогу, / Апірышча, спагаду і ахову» («Прыходжу да свяцілішча ляснога...»); «Маўчыць непрыступны Парнас, / А творцы з уласных «парнасікаў» – / Хто свой! – прапануюць абраз… // Ратуюся лесам і класікай» («Ратуюся…»).

Побач з «бярозавым» міні-цыклам у «Апраўданні» вылучаецца «грыбны». У вершах «Узгоркі ледніковыя», «Грыбное», «Нібы ў хованкі гуляем…», «Рыжыкі», «Сакрэт», «Яшчэ і яшчэ раз – “Царства Грыбное”», «Катаракта» (пералічаныя творы ўвайшлі таксама і ў нізку «Царства Грыбное») В. Зуёнак жартам і ўсур’ёз расказвае пра сваё вялікае захапленне, дае парады аматарам. «Грыбы не любяць злых, / Грыбы ад злых хаваюцца» («Сакрэт»), – напэўна, галоўная інтэнцыя твораў гэтай тэматыкі.

Асобная група лысагорскіх вершаў прысвечана адной з ключавых у Зуёнкавым набытку нябеснай тэме («Нябеснае лета», «Верасень з Юпітэрам», «У касмічным міжзор’і…»). Аб’ектам мастацкага даследавання тут выступае трыяда «прырода – космас – бог» ва ўзаемадачыненні з чалавекам: «У касмічным міжзор’і – / Ні памежжаў, ні дат, / І ніхто не прыгорне / І не верне назад. // Ва ўсясветным рэжыме / Кропляй духу ляцім… // Для каго мы чужыя / І хто нам пабрацім – / Знаць-не-знаем, і, пэўна, / Знаць не дадзена нам, – / Бог зямную даў крэўнасць / Чалавечым сынам. // Што ж яе мы дратуем / Варажнечай і злом, / І суладнасць святую / Асуджаем на злом?..»

(«У касмічным міжзор'і…»). Філосаф і гуманіст В. Зуёнак імкнецца знайсці адказы на вечныя пытанні, прыадчыніць заслону патаемнага…

Нізка «Апраўданне Лысай гары» атрымалася тэматычна цэласнай і кампазіцыйна завершанай. Разам з тым лысагорскія творы з'яўляюцца арганічным складнікам мастацкага свету В. Зуёнка, у чарговы раз засведчыўшы высокае паэтычнае майстэрства нашага сучасніка.

*Бібліяграфічны спіс:*


1. Зуёнак, В. Апраўданне Лысай гары [Электронны рэсурс] / В. Зуёнак // Васіль Зуёнак : сайт. – Рэжым доступу: https://sites.google.com/site/vasilzueenak/тэмы-і-мэты/апраўданне-лысай-гары. – Дата доступу: 29.08.2024.
2. Гніламёдаў, У. В. Васіль Зуёнак / У. В. Гніламёдаў // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. – Т. 4. Кн. 1 : 1966–1985 / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – 2002. – С. 620–644.